**М.І.Аксюцік,** *дацэнт*

# СТАНАЎЛЕННЕ І РАЗВІЦЦЁ АДУКАЦЫІ Ў СФЕРЫ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

Пазашкольная адукацыя ў XIX ст. у асноўным забяспечвалася кадрамі іншых, блізкіх па зместу дзейнасці, прафесій – настаўнікамі, работнікамі літаратуры і мастацтва, навукоўцамі, прадстаўнікамі прагрэсіўнай інтэлігенцыі і інш. Цэнтралізаваная і мэтанакіраваная падрыхтоўка кадраў для сацыяльна-культурнай сферы таго часу ўвогуле адсутнічала.

Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. пазашкольная адукацыя з грамадска-дэмакратычнага руху пераўтвараецца ў дзяржаўную сістэму культурна-асветніцкай і масава-палітычнай работы, якая патрабуе адпаведную колькасць спецыяльна падрыхтаваных кадраў – арганізатараў пазашкольнай дзейнасці. Ужо тады, у рэвалюцыйныя і першыя паслярэвалюцыйныя гады, сцвярджалася думка аб тым, што фарміраванне кадраў пазашкольнай работы належыць весці па двух кірунках – праз сістэму скарочаных курсаў для працуючых, якія маюць вопыт работы, і арганізацыю спецыяльнай навучальнай установы.

У студзені 1918 г. у часопісе «Народная асвета» (№ 1–2) з'явілася аб'ява, у якой паведамлялася аб адкрыцці 12 (25) лютага першых, а 26 сакавіка (8 красавіка) другіх курсаў пазашкольнай адукацыі з тэрмінам заняткаў у шэсць тыдняў. Дзяржаўная камісія па пазашкольнай адукацыі Камісарыята народнай асветы распрацавала палажэнне аб курсах, іх праграму, сфармулявала задачу – падрыхтаваць кадры, якія змогуць кіраваць на месцах дзейнасцю культурна-асветніцкіх арганізацый. Слухачы курсаў павінны былі азнаёміцца з агульнымі пытаннямі пазашкольнай адукацыі, з асновамі педагогікі, спецыфікай дзейнасці пазашкольных устаноў, сярод якіх вызначаліся бібліятэкі-чытальні, а таксама народныя дамы, народныя тэатры, народныя хары і аркестры, клубы. Пры гэтым клубам у гэтым шэрагу адводзілася аднолька-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

вас месца з іншымі напрамкамі развіцця народнай творчасці і самадзейнасці.

Але з прычыны складанага палітычнага становішча – пачаткам грамадзянскай вайны – курсы не пачалі працаваць у вызначаны тэрмін. Іх адкрыццё стала магчымым толькі у верасні 1918 г. у Петраградзе. Першая вышэйшая навучальная ўстанова, якая пачала рыхтаваць інструктараў і работнікаў пазашкольнай адукацыі, – Петраградскі інстытут пазашкольнай адукацыі (ПІПА), ён быў створаны 28 лістапада 1918 г. менавіта на базе гэтых курсаў. Ужо праз месяц, 20 снежня, першыя студэнты гэтага новага інстытута прынялі ўдзел ва ўрачыстым яго адкрыцці.

Развіццё культурна-асветніцкай адукацыі ў далейшым было цесна звязана з гісторыяй гэтага інстытута, які і цяпер з'яўляецца адным са старэйшых на постсавецкай прасторы. Звернемся да гэтай гісторыі, якая абагульняецца ў артыкуле Н.І. Сяргеевай у навуковым зборніку, надрукаваным да 70-годдзя Санкт-Пецярбургскага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтва імя Н.К.Крупскай [1].

Відавочная пераемнасць паміж інструктарскімі курсамі па пазашкольнай адукацыі, якія працавалі з 25 верасня 1918 г., і Інстытутам пазашкольнай адукацыі. Курсы імкнуліся ахапіць сваім уплывам работнікаў амаль усіх пазашкольных (культурна-асветных) установ. Гэтую традыцыю прадоўжыў інстытут. Ужо ў першы год яго работы былі закладзены асновы падрыхтоўкі спецыялістаў, многія з якіх з'яўляюцца традыцыйнымі для адукацыі ў сацыяльна-культурнай сферы па сённяшні дзень. Сярод іх – спалучэнне агульнанавуковай і спецыяльнай падрыхтоўкі. Агульнанавуковая падрыхтоўка разглядалася як абавязковая ў фарміраванні пазашкольных работнікаў. Яна ажыццяўлялася на так званым агульнаабавязковым, або асноўным, аддзяленні на працягу 3–4 месяцаў. У першы год студэнты ПІПА вывучалі гісторыю культуры, сацыялогіі, рэвалюцыйнага руху, палітычную эканомію, гісторыю літаратуры, уводзіны ў эстэтыку. Паказальным і некалькі нечаканым з'яўляецца той факт, што грамадска-

палітычныя і ідэалагічныя дысцыпліны ў вучэбным плане першага года амаль адсутнічалі.

На асноўным аддзяленні студэнты атрымоўвалі агульнае ўяўленне аб усіх відах пазашкольнай работы (практыка пазашкольнай адукацыі ў Расіі і за мяжой, фізічная адукацыя, галоўныя пытанні народнай адукацыі, а таксама асновы тэхнікі культурна-асветніцкай работы, метады даследавання культурна-асветніцкай справы і арганізацыя яе практыкі). План асноўнага аддзялення ўключаў першапачаткова і агульнаадукацыйныя дысцыпліны, такія, напрыклад, як біялогія, анатомія, фізіялогія, матэматыка, што тлумачыцца складам студэнтаў, некаторыя з якіх не мелі сярэдняй адукацыі.

Спецыяльная падрыхтоўка пачыналася пасля завяршэння цыкла агульнаадукацыйных дысцыплін у асобных групах – пададдзелах. Сярод шасці пададдзелаў, якія мeліся ў структуры інстытута ў пачатку 1919 г., на трох ажыццяўлялася падрыхтоўка культурна-асветніцкіх работнікаў – інструктарскім, тэатральным і музычным.

На інструктарскім пададдзеле рыхтавалі загадчыкаў культурна-асветных аддзелаў у рэгіёнах, інструктараў пазашкольнай адукацыі, але перш за ўсё загадчыкаў пазашкольных аддзелаў камітэтаў народнай асветы. Такім чынам, рыхтаваліся кадры пад непасрэдныя пасады. У цэлым іх называлі арганізатарамі і настаўнікамі пазашкольнай адукацыі.

У тэатральных і музычных групах рыхтавалі спецыялістаў, якіх мы амаль да 90-х гадоў XX ст. называлі культурна-асветніцкімі работнікамі з мастацкай спецыялізацыяй (кіраўнік самадзейнага мастацкага калектыву). Цяпер гэтыя спецыялізацыі ў вышэйшых навучальных установах культуры, на жаль, адсутнічаюць.

Трэба адзначыць, што так званае супрацьстаянне мастацкіх і клубных кафедраў існавала на працягу гісторыі ўсіх інстытутаў культуры, таму што ў кожным з іх імкнуліся да самастойнасці, дубліруючы тым самым работу спецыяльна існуючых навучаль-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных установ – кансерваторый, тэатральных, мастацкіх, харэаграфічных.

Не аналізуючы сутнасць гэтай канфліктнай сітуацыі, якая сёння не на карысць клубных дысцыплін, адзначым меркаванне педагогаў, якія стаялі ля вытокаў культурна-асветніцкай адукацыі і сцвярджалі, што ў задачы інстытута не павінна ўваходзіць падрыхтоўка вузкіх спецыялістаў – музыкантаў-тэарэтыкаў, інструменталістаў, спевакоў, а толькі «педагогов для музыкальных занятий с народом и организаторов-руководителей народной музыкальной жизни». Кампазітар П.А. Пятроў, з імем якога звязана нараджэнне музычнай спецыялізацыі ў Інстытуце пазашкольнай адукацыі, тады растлумачваў: «Жизнь настойчиво требует работников, которые обладали бы вполне достаточными знаниями и умениями, чтобы организовать хоровой коллектив, вести занятия по изучению нотной грамоты со взрослыми, заинтересовать народ им же созданной песней и повести его на путь нового песенного творчества, организовать музыкальный кружок, устроить народно-музыкальный спектакль, концерт и т.п.» [2].

Адзначым, што гэтае меркаванне амаль не страціла сваёй актуальнасці і сёння.

Зыходзячы з вышэйазначаных пазіцый, у вучэбных планах і тэатральнай, і музычнай спецыялізацый пераважалі вучэбныя дысцыпліны, якія найперш вучылі методыцы асветніцкай і адукацыйнай дзейнасці ў галіне тэатральнага і музычнага мастацтваў, а не навыкам выканання або кіравання (дырыжор, рэжысёр) музычнымі і тэатральнымі калектывамі.

Што тычыцца лёсу інструктарскага аддзела, які рыхтаваў кадры кіраўнікоў, трэба адзначыць нестабільнасць яго існавання ўвогуле. У канцы 1919 г. ён быў скасаваны і заменены скарочанымі курсамі клубных работнікаў. Вучэбны план курсаў паўтараў агульнаадукацыйную праграму інстытута, але ў скарочаным варыянце. Спецыяльная падрыхтоўка ўключала новае – гісторыю клубаў у Расіі і за яе межамі і асноўныя напрамкі клубнай дзейнасці – бібліятэчную, тэатральную і музычную справу. На прак-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

тычных занятках вывучаліся формы дзейнасці клуба (лекцыі, экскурсіі, кінематограф, арганізацыя гурткоў і таварыстваў), закраналіся таксама пытанні кіравання (статыстыка, справаводства ў клубе, тэхніка культурна-асветніцкай работы). Такім чынам, падрыхтоўка кадраў для клубаў пачалася з 1919 г., але толькі на базе курсаў.

Тым не менш клубная спецыялізацыя атрымала пэўную канкрэтнасць, стала фарміравацца методыка клубнай работы. Таму не выпадкова ў пачатку 20-х гадоў, калі дзяржава звяртаецца да пытання актывізацыі палітыка-асветніцкай работы, якая змяняе пазашкольную адукацыю, кадравы попыт на спецыяліста-палітасветніка рэзка ўзрастае. Ужо ў 1924/25 навуч. годзе аднаўляецца прыём студэнтаў на клубным аддзяленні. Але разам са зменай кірунку падрыхтоўкі спецыялістаў Інстытут пазашкольнай адукацыі рэарганізуецца ў Педагагічны палітыка-асветны і яму надаюць імя Н.К. Крупскай.

Змена назвы вызначыла новыя працэсы ідэалагізацыі выхаваўчай дзейнасці ўстаноў культуры і адукацыі, якія дамінавалі ў сацыяльна-культурнай дзейнасці амаль да канца XX ст. Давяршыла працэс поўнай ідэалагізацыі зместу дзейнасці інстытута яго перайменаванне ў 1925 г. у Ленінградскі камуністычны палітыка-асветны інстытут імя Н.К. Крупскай. Гэтыя змены запатрабавалі новага зместу навучання студэнтаў. Аднак асноўныя напрамкі дзейнасці інстытута захаваліся. У яго структуры засталіся тры аддзяленні – школьнае, бібліятэчнае і аддзяленне, назвы якога будуць мяняцца, але пад кожнай з іх яно будзе ажыццяўляць падрыхтоўку культурна-асветніцкіх работнікаў. Пасля клубнага аддзялення яно ў 1929 г. стала называцца аддзяленнем масавай работы з гарадскім і сельскім ухіламі. З 1935 г. – гэта факультэт палітасветработы.

Каго ж рыхтавалі на палітыка-асветным факультэце ў 30-я гады, а раней на масавым, а яшчэ раней на клубным аддзяленнях? Што разумелася пад гэтай спецыяльнасцю? Гэтыя пытанні праходзілі праз усю гісторыю культурна-асветніцкай адукацыі. Ва



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ўмовах набору ў інстытут 1927 г. агульная задача фармулявалася як падрыхтоўка «работников, которые нужны для наступательного движения на одном из важнейших участков социалистического строительства – на фронте культурной революции, – работников, которые смогли бы осуществить заветы Ленина в деле политического просвещения рабочих и крестьян». Увага, такім чынам, фіксавалася на палітычнай асвеце працоўных, якая павінна была ажыццяўляцца ў розных установах культуры. У клубах гэтую работу выконвалі метадысты-арганізатары, як называліся выпускнікі клубнага аддзялення. Студэнты клубнага аддзялення інстытута рыхтаваліся для работы ў якасці кіраўнікоў масавай (агітацыйнай) работы ў парткамах, як інструктары клубнай справы ў прафсаюзах, арганізатары масавай і палітыка-асветніцкай работы на сяле.

Акрамя таго, тыя, хто праходзіў спецыяльную прафілізацыю, мелі магчымасць працаваць у кабінетах агітацыі і прапаганды культработы і палітасветработы, у тых установах, якія адыгрывалі значную ролю ў сістэме палітычнай асветы, а таксама выкладчыкамі палітасветдысцыплін у партыйных школах і педагагічных тэхнікумах.

Як бачна з гэтага пераліку пасад і месцаў работы, профіль спецыяліста і сфера яго дзейнасці надзвычай нявызначаныя. Работнік сацыяльна-культурнай сферы той пары выступае ў ролі тлумачальніка ідэй партыі і ўрада. Таму не выпадкова, калі ў канцы 30-х гадоў абвяшчаецца аб «поўнай перамозе ідэй сацыялізму і камунізму ў СССР», неабходнасць у падобнага роду работнікаў адпадае, і ў маі 1941 г. інстытут набывае назву – Бібліятэчнага, што, натуральна, вызначае скасаванне ўсіх іншых факультэтаў, у тым ліку і палітыка-асветнага.

Ён адраджаецца толькі ў 1957 г. Ставіцца задача падрыхтоўкі культурна-асветніцкіх работнікаў па двух напрамках: у першую чаргу клубнага работніка і таксама кіраўніка мастацкай самадзейнасці. У 1974 г. спецыяльнасць «клубны работнік» удаклад-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

няецца, і ўпершыню ажыццяўляецца набор на спецыялізацыю «метадыст-арганізатар клубнай работы».

Такім чынам, у час адкрыцця Мінскага інстытута культуры ў 1975 г. інстытуты культуры ў СССР ажыццяўлялі набор на тры асноўныя групы спецыялізацый – бібліятэчная справа, метадысты-арганізатары клубнай работы і кіраўнікі самадзейных мастацкіх калектываў (па жанрах). Менавіта на гэтыя спецыялізацыі і ажыццявіла першы набор студэнтаў новая беларуская вышэйшая навучальная ўстанова, якая сёння завецца Беларускім дзяржаўным універсітэтам культуры.

---

1. *Опыт* и проблемы высшего культурно-просветительного образования в СССР: Сб. науч. тр. / Под ред. Е.Я.Зазерского. – Л.: ЛГИК, 1988. – 205 с.

2. *Петров П.А.* О музыкальном отделении института // Внешкольное образование. – 1919. – № 4-5. – С.12.

**В. И.Андреев,** *профессор*

## СОЦИОКУЛЬТУРНЫЕ ПРОЦЕССЫ В КОНТЕКСТЕ РЕФОРМ ОБРАЗОВАНИЯ В РЕСПУБЛИКЕ БЕЛАРУСЬ И ЗА РУБЕЖОМ

Исследование социокультурных процессов в ходе реформ образования в развитых странах мира свидетельствует о их сложности и противоречивости. К развитым странам, по данным Статистического ежегодника ЮНЕСКО за 1999 г., относятся 53 государства, включая все европейские государства, среднеазиатские республики бывшего Советского Союза, США, Канаду, Австралию, Новую Зеландию, Японию и Израиль. Остальные государства считаются развивающимися.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ